# Электронны зварот

Паважаны наведвальнік!

З 2 студзеня 2023 г. уступіў ў дзеянне з дапаўненнямі і змяненнямі Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» (рэд. ад 28.06.2022), які устанаўлівае падачу ў дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі электронных зваротаў і атрыманне адказаў (апавяшчэнняў) на іх з дапамогай дзяржаўнай адзінай (інтэграванай) рэспубліканскай інфармацыйнай сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб (сістэма ўліку і апрацоўкі зваротаў).

Доступ карыстальнікаў да сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў забяспечваецца з дапамогай сайта ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт па адрасе **https://обращения.бел** (інтэрнэт-сайт).

**Паважаны наведвальнік!**

Перш чым задаць сваё пытанне прапануем азнаёміцца з адказамі на пытанні, якія найбольш часта задаюць, у рубрыках «Часта задаваемыя пытанні», «Адказы на электронныя звароты, якія носяць масавы характар», «Адказы на пытанні, якія паступілі на сайт vsebel.by»

**Электронныя звароты грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў (далей –грамадзяне), і юрыдычных асоб у Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь накіроўваюцца і разглядаюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года ”Об обращениях граждан и юридических лиц“.**

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года ”Об обращениях граждан и юридических лиц“ электронны зварот выкладаецца на беларускай або рускай мове.

**Электронны зварот грамадзяніна ў абавязковым парадку павінен змяшчаць:**

- прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку або ініцыялы грамадзяніна;
- адрас месца жыхарства (месца знаходжання) грамадзяніна;
- выклад сутнасці звароту;
- адрас электроннай пошты грамадзяніна.

**Электронны зварот юрыдычнай асобы ў абавязковым парадку павінен змяшчаць:**

- поўнае найменне юрыдычнай асобы; месца знаходжання юрыдычнай асобы; выклад сутнасці звароту;
- прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку асобы, упаўнаважанай падпісваць звароты;
- адрас электроннай пошты юрыдычнай асобы.

Электронныя звароты павінны быць разгледжаны не пазней за 15 дзён, а калі патрабуецца дадатковае вывучэнне і праверка – не пазней за 1 месяц.

Адказы на электронныя звароты накіроўваюцца ў электронным выглядзе на адрас электроннай пошты, пазначаны ў электронным звароце, або ў пісьмовым выглядзе - на адрас месца жыхарства (месца знаходжання) грамадзяніна або месца знаходжання юрыдычнай асобы ў выпадках, устаноўленых Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года ”Об обращениях граждан и юридических лиц“.

Пакідаюцца без разгляду па сутнасці звароты, якія (па якіх):

- выкладзены не на беларускай або рускай мове;
- не змяшчаюць прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку, адраса месца жыхарства (месца знаходжання) грамадзяніна;
- не змяшчаюць поўнага наймення юрыдычнай асобы і адраса яе месца знаходжання, прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку кіраўніка або асобы, упаўнаважанай ва ўстаноўленым парадку падпісваць звароты (для юрыдычных асоб);
- змяшчаюць тэкст, які не паддаецца прачытанню;
- змяшчаюць нецэнзурныя або зняважлівыя словы або выразы;
- падлягаюць разгляду ў адпаведнасці з заканадаўствам аб канстытуцыйным судаводстве, грамадзянскім, грамадзянскім працэсуальным, гаспадарчым працэсуальным, крымінальна-працэсуальным заканадаўствам, заканадаўствам, якое вызначае парадак адміністрацыйнага працэсу, заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах; у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі вызначаны іншы парадак падачы і разгляду такіх зваротаў;
- змяшчаюць пытанні, якія не адносяцца да кампетэнцыі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь;
- прапушчаны без уважлівай прычыны тэрмін падачы скаргі;
- пададзены паўторны зварот, калі ён ужо быў разгледжаны па сутнасці і ў ім не указваюцца новыя абставіны, якія маюць значэнне для разгляду звароту па сутнасці;
- з заяўнікам спынена перапіска.

Грамадзян, якія звяртаюцца ў Міністэрства ад імя або ў інтарэсах іншых асоб, у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 года ”Об обращениях граждан и юридических лиц“ просім прыкладаць копіі дакументаў, што пацвярджаюць такія паўнамоцтвы, у электронным выглядзе праз раздзел ”Прымацаваць файл“, прадугледжаны модулямі ”Электронны зварот“.

У адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 498 ”О дополнительных мерах по работе с обращениями граждан и юридических лиц“ звароты (прапановы, заявы, скаргі) грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і юрыдычных асоб (далей, калі не ўказана іншае, – зварот) незалежна ад таго, у які дзяржаўны орган або іншую арганізацыю (далей, калі не ўказана іншае, – арганізацыя) яны паступілі, першапачаткова падлягаюць разгляду па сутнасці ў адпаведнасці з кампетэнцыяй:

- у мясцовых выканаўчых і распарадчых органах, падпарадкаваных ім арганізацыях, тэрытарыяльных падраздзяленнях (органах) і арганізацыях, падпарадкаваных або ўключаных у склад (сістэму) рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і

дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, другім дзяржаўным органам, іншым арганізацыям, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць і размешчаны ў межах той адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, на тэрыторыі якой узніклі пытанні, выкладзеныя ў зваротах;
- у іншых арганізацыях, калі пытанні, указаныя ў зваротах, адносяцца да выключнай кампетэнцыі гэтых арганізацый.

**ПЕРАЛІК дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, адказных за разгляд зваротаў па сутнасці ў асобных сферах жыццядзейнасці насельніцтва** (п.30. Сувязь і інфарматызацыя).

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/elektronny-zvarot*